# РЭЦЭНЗІЯ

## ТАЛМАЧОВА, С. А. МЯСЦОВЫЯ ОРГАНЫ ДЗЯРЖАЎНАГА КІРАВАННЯ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ АГРАРНАЙ ПАЛІТЫКІ САМАДЗЯРЖАЎЯ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (1861–1914 гг.) : МАНАГРАФІЯ / С. А. ТАЛМАЧОВА. – МІНСК : БДПУ, 2019. – 344 с.

За апошнія дзесяцігоддзі беларускія навукоўцы ліквідавалі шэраг белых плямаў у гісторыі Беларусі XIX–XX стст. Да нядаўняга часу недастаткова вывучанай заставалася гісторыя мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі самадзяржаўя на тэрыторыі Беларусі ад адмены прыгоннага права да Першай сусветнай вайны. Менавіта гэтай тэме прысвечана манаграфія С. А. Талмачовай.

У рэцэнзуемай манаграфіі ўпершыню комплексна даследуюцца асноўныя праблемы фарміравання і дзейнасці сістэмы органаў дзяржаўнага кіравання па ажыццяўленні аграрнай палітыкі самадзяржаўя ў 1861–1914 гг.; асвятляюцца асаблівасці ўрадавай палітыкі па фарміраванні кадравага складу мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі Расійскай імперыі; падрабязна і ўсебакова аналізуецца практычная дзейнасць губернскіх па сялянскіх справах прысутнасцей, міравых пасрэднікаў і іх павятовых з'ездаў, павятовых паверачных камісій, павятовых па сялянскіх справах прысутнасцей, губернскіх прысутнасцей, земскіх начальнікаў і іх павятовых з'ездаў.

У адрозненне ад большасці папярэдніх даследчыкаў дадзенай праблемы навукоўца акцэнтуе ўвагу на перадумовы, прычыны і вынікі фарміравання названых інстытутаў.

Нельга не згадзіцца з высновай С. А. Талмачовай, што большасць прац па тэме даследавання пабудавана на даведачнай літаратуры, а таксама на друкаваных крыніцах. Не выпадкова ў працах амерыканскіх гісторыкаў ставіцца пытанне аб недахопе адпаведных навуковых даследаванняў, з'яўленне якіх «цалкам можа змяніць наша ўспрыманне праблем Расійскай імперыі і яе перспектыў». Дзякуючы дэталёваму і ўдумліваму аналізу шырокага кола крыніц, у тым ліку заканадаўчых актаў, матэрыялаў справаводства органаў і ведамстваў рознага ўзроўню, перыядычнага друку, матэрыялаў асабістага паходжання, пераважная большасць высноў аўтара манаграфіі пераканаўча аргументавана і не выклікае супярэчанняў.

Рэцэнзуемая кніга з'яўляецца арыгінальнай, дзякуючы ўмеламу выкарыстанню своеасаблівай метадалогіі даследавання. У сувязі з гэтым С. А. Талмачова адзначае: «Складанасць аб'екта даследавання абумовіла адпаведную метадалогію, заснаваную на сінтэзе разнастайных падыходаў. Яно праведзена на аснове прынцыпаў гістарызму, аб'ектыўнасці і каштоўнаснага падыходу. Аб'ектыўнасць навуковых высноў была дасягнута з дапамогай аналізу і сінтэзу інфармацыі разнастайных крыніц, усебаковага вывучэння прадмета даследавання шляхам выяўлення яго сутнасці і сувязей з іншымі аб'ектамі гістарычнай рэчаіснасці, удакладнення атрыманых высноў праз суаднясенне і супастаўленне іх з дасягненнямі сучаснай і ранейшай гістарыяграфіі».

Акрамя крыніц на рускай і беларускай мове, аўтарам былі выкарыстаны важныя і прынцыповыя крыніцы на польскай, нямецкай і англійскай мовах.

На прыкладзе манаграфіі С. А. Талмачовай можна яскрава прасачыць, як паспяхова развіваецца беларуская гістарычная навука, мяняюцца падыходы, вучоныя гістарычнай навукі праяўляюць навуковую смеласць і рашучасць у пошуках ісціны.

Вельмі важна, што аўтар навуковай працы не пазбягае «вострых момантаў», не баіцца рабіць новыя высновы, абапіраючыся на шматгадовае вывучэнне фондаў архіваў Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь.

У той час як розныя даследчыкі выказваюць розныя думкі аб узроўні незалежнасці інстытута міравых пасрэднікаў, аўтар манаграфіі прыходзіць да наступнай высновы: «Ён (інстытут – *Э. І.*) не ўпісваўся ў іерархічную структуру вертыкалі органаў улады і кіравання, з'яўляўся практычна незалежным па спосабе фарміравання і функцыянальных абавязках не толькі ад мясцовых губернатараў і генерал-губернатараў, але і Міністэрства ўнутраных спраў».

Нельга не згадзіцца з думкай С. А. Талмачовай, што стварэнне інстытута земскіх начальнікаў было неапраўданым з пункту гледжання

РЭПОЗІТОРЫЙ БДПУ

новых патрабаванняў часу, таму што земскія начальнікі ў значнай ступені дубліравалі функцыянальныя абавязкі сваіх папярэднікаў – міравых пасрэднікаў.

Аўтар гэтых радкоў лічыць таксама арыгінальнай думку аўтара манаграфіі, што актуальнай стала і праблема рэфармавання валаснога сялянскага самакіравання, якое перастала ўпісвацца толькі ў межы саслоўнага, логіка падказвала неабходнасць пераўтварэння яго ў бессаслоўную земскую адзінку.

Адзначаючы станоўчыя бакі рэцэнзуемай манаграфіі, нельга не выказаць некаторыя заўвагі і пажаданні.

Так, у раздзеле «Гістарыяграфія праблемы» першай главы павярхоўна асветлены навуковыя працы беларускіх гісторыкаў К. І. Шабуні, Х. Ю. Бейлькіна, П. Д. Верашчагіна, кандыдацкая дысертацыя А. Д. Кузьміна «Социокультурный облик чиновничества белорусских губерний (1864–1914)» (Магілёў, 2017). Шкада, што ў манаграфіі адсутнічаюць імянны і геаграфічны паказальнікі.

У заключэнне адзначым, што манаграфія С. А. Талмачовай напісана на высокім навуковым узроўні і адрасуецца навукоўцам, выкладчыкам, аспірантам, магістрантам і студэнтам гістарычных факультэтаў вышэйшых навучальных устаноў, а таксама ўсім, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі.

*Эмануіл Рыгоравіч Іофе,*
*доктар гістарычных навук, прафесар кафедры паліталогіі і права БДПУ*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ